**Кацярына Сандакова**

**Бібліятэкар
Лідскай раённай бібліятэкі
імя Янкі Купалы**

# ШЛЯХ ДА ДУХОЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Бібліятэка – гэта храм кнігі, яна захавальніца гісторыі, усяго, што сабрала чалавецтва на працягу свайго шляху. Царква і бібліятэка адзіныя ў вырошчванні ў сэрцах і душах чалавечых любові да бліжняга, міласэрнасці і памяркоўнасці адзін да аднаго. Супрацоўніцтва Лідскай раённай бібліятэкі імя Янкі Купалы і Лідскай епархіі Беларускага Экзархата Рускай Праваслаўнай Царквы ў справе духоўнай асветы вымяраецца не адным годам.

Кожны з філіялаў узаемадзейнічае са святарамі Лідскай епархіі ў сваёй працы, асноўнай мэтай такіх сустрэч стае папулярызацыя праваслаўнай кнігі і культурных традыцый, чытачоў знаёмяць з гісторыяй храмаў і захавальнікамі веры. Сумесная праца бібліятэкі і праваслаўнай царквы накіравана на духоўна-маральнае выхаванне дзяцей і падлеткаў, пашырэнне ведаў пра традыцыі сям'і і знаёмства з новымі фактамі з гісторыі Лідскага раёна.

Па ініцыятыве архіепіскапа Навагрудскага і Лідскага Гурыя з 1 ліпеня 2014 г. на базе Лідскай гарадской бібліятэкі-філіяла № 4 пачала сваю работу епархіяльная бібліятэка Свята-Міхайлаўскага кафедральнага сабора г. Ліды, што стала значным крокам да пашырэння ўзаемадзеяння.

У 2016 г. пры епархіяльнай бібліятэцы быў створаны праваслаўны клуб «Нядзельныя сустрэчы». Прысутныя на пасяджэннях маюць магчымасць не толькі больш даведацца аб праваслаўі, але і задаць пытанні святарам, абмеркаваць актуальныя тэмы.

Адной з форм супрацоўніцтва бібліятэкі і храма стаў штогадовы выставачны праект, прымеркаваны да Дня праваслаўнай кнігі, які сёлета прайшоў пад назвай «Праваслаўная кніга – шлях да дабра і міру». Сваю працу ён распачаў 17 сакавіка 2023 г. у епархіяльнай бібліятэцы.

Праект прымеркаваны да важнай культурнай падзеі – Дня праваслаўнай кнігі, які ў 2023 г. арганічна ўплятаецца ў Год міру і стварэння. З'яўляючыся скарбніцай высокай культуры, сапраўдных ведаў і непарушнай маральнасці, кніга і чытанне заклікаhistoireаны ствараць сучаснасць з клопатам пра будучыню, дапамагаючы ўсведамляць і ўбіраць веліч духоўна-маральнай спадчыны народа, вопыт папярэдніх пакаленняў.

Праведзенае ў дзень адкрыцця праекта мерапрыемства ўключала ў сябе прэзентацыю двух выстаў: старадрукаванай царкоўнай кнігі і праваслаўнай літаратуры сучаснай рэдакцыі.

Цікавым і змястоўным стала выступленне сакратара Лідскай епархіі протаіерэя Максіма Цыгеля, які паведаміў прысутным пра значэнне Бібліі ў духоўным і свецкім жыцці чалавека, а таксама пазнаёміў са старадаўнімі рэлігійна-царкоўнымі выданнямі, якія адрозніваюцца ўнікальнай культурай кнігадрукавання.

Сучасныя выданні праваслаўнай літаратуры, якія былі прадстаўлены ў другой экспазіцыі выставы, значна адрозніваліся ад выданняў першай. Гэта яркія, маляўнічыя кнігі з фонду епархіяльнай бібліятэкі, які налічвае больш за 2 тыс. экзэмпляраў, не лічачы электронныя носьбіты, часопісы і календары. На шматлікім кніжным матэрыяле адлюстраваны шлях Беларускай Праваслаўнай Царквы, гісторыя і лёс яе храмаў і святынь. Былі экспанаваны жыціі вялікіх беларускіх падзвіжнікаў і святых. Асобна выдзялялася праваслаўная мастацкая літаратура для дзяцей.

Агляд кніжных навінак праваслаўнай літаратуры ад беларускіх і расійскіх выдавецтваў прадставіла Анастасія Смаляк, бібліятэкар Лідскай гарадской бібліятэкі № 4.

З мэтай выхавання беражлівых адносін да духоўнай і культурнай спадчыны беларус-

кага народа з 17 па 24 сакавіка 2023 г. былі арганізаваны сустрэчы духавенства Лідскай епархіі з навучэнцамі дзяржаўных устаноў адукацыі г. Ліды. Яны змаглі адкрыць для сябе шмат новага і цікавага, а таксама атрымаць адказы на хвалюючыя пытанні.

21 сакавіка 2023 г. бібліятэку наведалі навучэнцы 6–7-х класаў сярэдняй школы № 4 г. Ліды. Гутарку з дзецьмі ладзіў святар храма Усіх Святых протаіерэй Уладзімір Яроміч, які распавёў пра хрысціянства, праваслаўную кнігу, растлумачыў, чаму неабходна чытаць духоўныя кнігі і якія кнігі трэба чытаць у маладым узросце. Асаблівая ўвага была нададзена галоўнай кнізе праваслаўнага чалавека – Бібліі.

Выставачны праект «Праваслаўная кніга – шлях да дабра і міру» наведалі навучэнцы 3–5-х класаў сярэдняй школы № 11 г. Ліды. Святар Сергій Андрухавец, настаяцель храма «Сысканне загінулых» г. Ліды кампетэнтна, цікава і ў той жа час вельмі даступна распавядаў дзецям пра рэдкія і каштоўныя старадрукі. Не абышлося без пытанняў да выступоўца, што сведчыць: выстава знаходзіць сваіх прыхільнікаў.

24 сакавіка 2023 г. студэнты гуманітарнага аддзялення Лідскага каледжа пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце імя Янкі Купалы таксама наведалі Лідскую гарадскую бібліятэку № 4, каб азнаёміцца са зместам выставачнага праекта. Перад студэнтамі выступіў протаіерэй клірык храма святых Царскіх страстацерпцаў Аляксей Глінскі, які прачытаў даклад «Праваслаўныя святыя беларускай зямлі».

Выніковай кропкай стала ўрачыстае свята ў межах Тыдня праваслаўнай кнігі, якое адбылося 28 сакавіка 2023 г. у Лідскай дзіцячай школе мастацтваў. Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Лідская епархія Беларускага Экзархата Рускай Праваслаўнай Царквы і Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы.

Удзельнікамі мерапрыемства сталі святары, работнікі бібліятэк, выкладчыкі агульнаадукацыйных і нядзельных школ Лідскай епархіі. Да ўвагі гасцей была прадстаўлена кніжная выстава «Праваслаўная кніга – шлях да дабра і міру», якая дэманстравала як старадрукаваную царкоўную літаратуру, так і змяшчала выданні праваслаўнай літаратуры сучаснай рэдакцыі. Малебен на пачатак усякай добрай справы правёў епіскап Лідскі і Смаргонскі Парфірый у саслужэнні духавенства Лідскага благачыння. Пасля агульнай малітвы правячы архірэй нагадаў пра важнасць чытання духоўнай літаратуры.

Са словамі прывітання да прысутных звярнуліся сакратар Лідскага епархіяльнага ўпраўлення протаіерэй Максім Цыгель і намеснік старшыні Лідскага райвыканкама Генадзь Уладыка, які падкрэсліў асаблівую важнасць духоўна-асветніцкай дзейнасці, якую наладзілі ў цесным узаемадзеянні духавенства Лідскага благачыння і бібліятэкары Лідчыны.

З дакладам «Воін Хрыстовы. Жыровіцкі старац схіархімандрыт Мітрафан (Ільін)» выступіў протаіерэй Генадзь Логін, кандыдат багаслоўя, настаяцель храма ў гонар прарока Іллі в. Сурынка.

Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы атрымала ў падарунак кнігу нарысаў пра жыццё насельніка Жыровіцкага Свята-Успенскага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра схіархімандрыта Мітрафана (Ільіна). Дадзеная кніга будзе цікава ўсім, хто ў цяперашні трывожны час адчувае жыццёвую неабходнасць узрастання ў веры.

Таксама перад удзельнікамі выступіў Генадзь Малееў, выкладчык Мінскай духоўнай семінарыі, кандыдат багаслоўя, протадыякан з дакладам «Стаўленне хрысціяніна да сябе».

У канцы ўрачыстага свята з музычнымі нумарамі выступілі навучэнцы Лідскай дзіцячай школы мастацтваў, што надало мерапрыемству прыемную эстэтычную афарбоўку.

Граней узаемадзеяння бібліятэкі і храма досыць шмат. І ў далейшым мы будзем іх развіваць, знаходзіць новыя, ствараць цікавыя сумесныя праекты.

Дзейнасць бібліятэк Лідскага краю па гэтым напрамку працягваецца. Можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што праца гэта – яшчэ адзін крок да аднаўлення такіх паняццяў, як міласэрнасць, працавітасць, сумленнасць, цярпенне; крок да захавання лепшых традыцый зносін, сабornасці, павагі да старэйшага пакалення. Гэта яшчэ адно намаганне, якое дапаможа вярнуцца да нашых вытокаў.

Summary

The article presents the experience of interaction between the libraries of Lida and the Belarusian Orthodox Church in the framework of project activities.